ЗАЦВЯРДЖАЮ
Дырэктар ____ Г.У. Шугала
08.07.2019

# ПЛАН РАБОТЫ ЛАГЕРА ПРАЦЫ І АДПАЧЫНКУ “САДРУЖНАСЦЬ” ДУХОЎНА-МАРАЛЬНАГА НАПРАМКУ , ЯКІ ПРАЦУЕ ПРЫ ДУА “ТУРЭЦКІ ВУЧЭБНА-ПЕДАГАГІЧНЫ КОМПЛЕКС ДЗІЦЯЧЫ САД-СЯРЭДНЯЯ ШКОЛА”

УЗГОДНЕНА:
Начальнік упраўлення адукацыі
Карэліцкага райвыканкама
___________ І.В.Асташэвіч
«___» ________ 2019 года

## Раздзел 1. Справаздача аб дзейнасці лагера працы і адпачынку "Садружнасць" з дзённым прабываннем дзяцей пры ДУА "Турэцкі вучэбна-педагагічны комплекс дзіцячы сад-сярэдняя школа" ў летні перыяд з 20.07.2018 па 12.08.2018 года

Аздараўленчы лагер працы і адпачынку "Садружнасць" з дзённым прабываннем дзяцей пры ДУА "Турэцкі вучэбна-педагагічны комплекс дзіцячы сад-сярэдняя школа" ў летні перыяд з 20.07.2018 па 12.08.2018 года функцыянаваў на аснове загада аддзела адукацыі Карэліцкага райвыканакама ад 13.04.2018 №239 "Аб арганізацыі аздараўлення дзяцей ў летні перыяд 2018года". Загадам па установе адукацыі ад 13.07.2018 года № 237 "Аб арганізацыі аздараўлення дзяцей у перыяд летніх канікул 2017/2018 навучальнага года" у лагер працы і адпачынку было залічана 10 навучэнцаў ва ўзросце ад 14 да 16 гадоў па асабістай заяве бацькоў. Колькасны склад удзельнікаў лагера: 2 дзяўчынкі і 8 хлопчыкаў. Сярод іх 3 – з мнагадзетных сем'яў, 2 – з няпоўных,1 -з малазабяспечанай сям'і. Усе навучэнцы з сем'яў работнікаў сельскай гаспадаркі.

Дысклакацыя лагера працы і адпачынку «Садружнасць" з дзённым прабываннем адбывалася ў памяшканнях ДУА "Турэцкі вучэбна-педагагічны комплекс дзіцячы сад-сярэдняя школа", сельгасугоддзях СПК імя Чарняхоўскага , складзе для захоўвання зерневых культур.

- штаб ЛПА – кабінет сакратара, 1 паверх;
- рабочыя месцы – сельгасугоддзе СПК ім. Чарняхоўскага, склад для захоўвання зерневых культур;
- спартыўныя гульні – спортзал, стадыён установы адукацыі;
- культурна-масавыя мерапрыемствы - 2-гі паверх, актавая зала;
- харчаванне навучэнцаў – сталовая ўстановы адукацыі.

Харчаванне навучэнцаў – членаў ЛПА забяспечвалі наступныя арганізацыі: Карэліцкі калбасны цэх, птушкафабрыка "Чырвонаармейская", хлебазавод Мір, "Фрутрэал" г. Полацк, "Аргаінвест" г. Столбцы, "Асстор і К" г. Баранавічы. Харчаванне было арганізавана ў суадносінах з санітарна-гігіенічнымі нормамі, кожны дзень праводзіўся кантроль якасці харчавання, вёўся бракеражны журнал, кожны тыдзень праводзілася кантрольнае ўзвешванне гатовых блюд.

У 2018 годзе дзейнасць лагера ажыццяўлялася ў рамках рэспубліканскай акцыі "Лета – час адкрыццяў" з мэтай фарміравання грамадзянска-патрыятычных якасцей навучэнцаў, адносін да арганізацыі летняга адпачынку, аздараўлення і часовай працоўнай дзейнасці непоўналетніх як важнаму і адказнаму перыяду ў жыцці дзяцей.

З навучэнцамі былі заключаны працоўныя дагаворы па часовай працоўнай занятасці моладзі, якая навучаецца ва ўстановах адукацыі, у свабодны ад вучобы час, якія вызначалі рэжым работы, правы і абавязкі бакоў з улікам патрабаванняў заканадаўства аб працы, аб ахове працы.

Акрамя таго, законныя прадстаўнікі былі азнаёмлены з відамі работ, якія будуць выконвацца дзецьмі ў лагеры працы і адпачынку. Перад пачаткам

працоўнай дзейнасці з удзельнікамі лагера праводзілася навучанне і праверка ведаў па правілах унутранага распарадку, рэжыма работы і адпачынку ў лагеры, бяспечным прыёмам работы, правілам бяспечных паводзін, пажарнай і электрычнай бяспекі.

Рэалізацыя задач выхавання і аздараўлення ў лагеры працы і адпачынку “Садружнасць” вялася ў суадносінах з праграмай выхавання дзяцей, якім неабходна аздараўленне, рэкамендацыямі па арганізацыі працы і адпачынку для падлеткаў 14-16 гадоў. На інтруктыўна-метадычнай нарадзе былі разгледжаны наступныя пытанні: “Выкананне санітарна-гігіенічных норм і правіл”, “Папярэджанне дзіцячага дарожна-транспартнага траўматызму”, “Арганізацыя работы па ахове працы і пажарнай бяспекі”. На першым пасяджэнні штаба ЛПА быў узгоднены план работы лагера працы і адпачынку, у якім дакладна прапісаны культурна-масавыя і спартыўныя мерапрыемствы, вызначаны час і адказныя за іх падрыхтоўку і правядзене.

Згодна плана рэалізацыім праграмы выхавання дзяцей, якім неабходна аздараўленне, ў лагеры працы і адпачынку “Садружнасць” ў летні перыяд 2015 года выхаваўчая работа вялася па трох напрамках: грамадзянска-патрыятычнаму, духоўна-маральнаму і прававому выхаванню, фарміраванню здаровага ладу жыцця.

Кожны дзень меў сваю назву: “Дзень адкрыццяў і знаёмства па-новаму”, “Падарожжа ў краіну здароўя”, “Інтэлектуальныя сустрэчы”, “Ідзём па сцяжынках славы нашых землякоў”, “Ад заняткаў фізічнай культурай да вялікіх спартыўных дасягненняў”, Казка патрэбна ў кожным узросце”, “Алімпійскі дзень”, і інш. Зыходзячы з тэматыкі дня планаваліся і мерапрыемствы. У канцы кожнага дня выхавацелі ў дзённіку-табліцы аналізавалі праведзеныя мерапрыемствы, працоўныя справы, выказвалі свае меркаванні, занатоўвалі дасягненні дня, акрэслівалі задачы на будучае.

Гульня – гэта працэс мадэліравання, калі аб’ядноўваюцца зносіны і пазнанне новага, неабходныя чалавеку для яго развіцця. Таму патрэбна было перад пачаткам мерапрыемстваў растлумачыць рабятам важнасць інтэлектуальных мерапрыемстваў, якія дапамогуць ім авалодаць сацыяльнымі навыкамі: працаваць у камандзе і вызначаць сваё месца ў сацыяльнай групе, быць камунікабельнымі і талерантнымі. Абапіраючыся на педагагічныя даследаванні, на анкетныя дадзеныя, выявілі, што большасць дзяцей у лагеры (85 %) з павышанай матывацыяй да творчай інтэлектуальнай дзейнасці. Таму мерапрыемствы праводзіліся, перш за ўсё абапіраючыся на такіх дзяцей і з імкненнем зацікавіць усіх астатніх. Лічым, што паспяхова прайшлі ў лагеры такія мерапрыемствы як гульня “Знаёмімся па-новаму”, сустрэча-інтэрактыўнае разважанне У жыццё без кепскіх звычак”, конкурс лістовак “Я супраць. А ты!”, інтэлектуальная гульня “Што? Дзе? Калі?”, запрашаем у самадзейны тэатр “Казачнае прадстаўленне”. Конкурсныя праграмы цікавыя і запамінальныя, дапамаглі вучням атрымаць мноства новай інфармацыі, павысіць агульнакультурны ўзровень і праявіць лідэрскія якасці. Многія рабяты праявілі сябе ў інтэлектуальнай творчасці па складанню пытанняў і заданняў, а таксама выступілі ў ролі вядучых. Для

многіх гульня стала стымулам для самаўдасканалення. А для выхаваценя кожны дзень галоўнай задачай з'яўлялася заўважыць здольнасці кожнага дзіцяці і дапамагчы яму развівацца, абавязкова зацікавіць дзяцей, каб яны адчувалі сябе ў калектыве добра і камфортна. Для правядзення інтэлектуальных гульняў спецыяльнага абсталявання не патрабуецца. Патрэбна толькі дзіцячая зацікаўленасць і жаданне дарослых захапіць дзяцей светам інтэлекту.

З мэтай папулярызацыі здаровага ладу жыцця, фарміравання здаровай нацыі ў лагеры былі праведзены наступныя мерапрыемствы: спаборніцтвы па футболу “”З футболам на ты”(у рамках рэспубліканскай акцыі “Лета на карысць”), спартыўная праграма “Усе на старт”, спартыўна-забаўляльныя праграмы.

Арганізацыя грамадзянска-патрыятычнага выхавання у ЛПА праводзілася ў рамках святкавання 70-й гадавіны Перамогі над фашысцкай Германіяй, 75-годдзя Карэліцкага раёна. Асабліва запамінальнымі сталі такія мерапрыемствы, як экскурсія “Помнікі нам расказваюць”, КТС “Стварай дабро”, брэйн-рынг “Экалагічны калейдаскоп”, конкурсна-гульнёвая праграма “Калейдаскоп прафесій, інтэрактыўная віктарына “Гісторыя роднага краю”.

**Рэйтынг мерапрыемстваў.** Наибольш цікавымі для рабят сталі гульнёвыя танцавальныя забаўляльныя праграмы, спартыўныя гульні, інтэлектуальныя віктарыны. У атрадзе былі, таксама, вучні, якім падабалася спакойная творчая дзейнасць: маляванне, лепка, размалёўка эскізаў, напісанне творчых работ. Такім дзецям стварaліся адпаведныя ўмовы для такой дзейнасці, арганізоўваліся творчыя індывідуальныя выставы, прэзентацыі работ.

Кожны дзень на свежым паветры праводзіліся фізкультхфілінкі ў выглядзе рытмікі, выканання фізічных практыкаванняў, кароткіх прабежак: фізкультурная размінка “Хутчэй становімся на ранішнюю, бадзёрую гімнастыку”, размінка-конкурс “Маё асабістае практыкаванне”, спартыўны калейдаскоп “Сярод летняй прыроды”, мініспартландыя “Са спортам мы сябры”, і інш.

2018-ы год аб'яўлены Годам малой Радзімы, таму большасць мерапрыемстваў былі накіраваны на развіццё творчага патэнцыялу выхаванцаў лагера працы і адпачынку.

**9. Педагагічныя вывады**

У выніку дзейнасці лагернай змены педагагічнаму калектыву удалося з поспехам вырашыць наступныя задачы:

- арганізацыя досугавай дзейнасці падлеткаў у вольны ад вучобы час;
- развіццё працоўных навыкаў, прафесіянальнай арыентацыі і замацаванне здароўя падлеткаў;
- фарміраванне навыкаў здаровага ладу жыцця і свядомых адносін да працы, свайго здароўя і акружаючага асяроддзя;
- фарміраванне адаптацыйных навыкаў і падрыхтоўка да жыцця ў грамадстве;

- развіццё творчых здольнасцей і цікавасцяў навучэнцаў, актыўнае прыцягненне да розных відаў дзейнасці.

Аднак у будучым неабходна звярнуць увагу на якасць правядзення мерапрыемстваў спартыўнай і інтэлектуальнай накіраванасці. Акцэнтаваць увагу на правядзенне сацыяльна-значымых спраў, надаць ім большую практычную накіраванасць. Неабходна, таксама, удасканаліць дыягнастычную і аналітычную дзейнасць ў выхаваўчай прасторы лагера (падбор дыягнастычнага інструментарыя, вядзенне атрадых дзённікаў). Пашырыць супрацоўніцтва з усімі зацікаўленымі прадстаўнікамі соцыума, прыцягненне бацькоў для больш эфектыўнага правядзення мерапрыемстваў у час работы лагера.

Начальнік лагера
працы і адпачынку “Садружнасць” Т.В. Гаро

**Раздзел 2. Абгрунтаванне агульных падыходаў, якія ляжаць у аснове выхаваўчай сістэмы лагера “Садружнасць”.**

Забяспечваючы працэс арганізацыі аздараўлення, адпачынку, працоўнай дзейнасці старэйшых падлеткаў у летні перыяд, кіруемся нарматыўнымі прававымі актамі, якія рэгуліруюць дзейнасць выхаваўча-аздараўленчых устаноў адукацыі і пытанні аздараўлення дзяцей, указаннымі ў метадычных рэкамендацыях, размешчаных на афіцыйных крыніцах.

Асноўная задача педагагічнага калектыву – стварыць умовы для замацавання здароўя, для арганізацыі правядзення вольнага часу старэйшых падлеткаў, выкарыстоўваючы магчымасці лагернай змены працягваць фарміраваць духоўна-маральную культуру вучняў на аснове праваслаўнай маралі і культуры беларускана народа.

Анкетаванне па пытанню правядзення летніх канікул сяро вучняў 8 –9 класаў паказала, што большасць з іх (74%) выявілі жаданне не толькі добра адпачыць у час летніх канікул, але і заняцца працоўнай дзейнасцю, правесці вольны час з карысцю для сябе і акружаючых.

У аснову дзейнасці лагера мы палажылі ідэю творчай, групавой і калектыўнай дзейнасці, заснаванай на развіцці ініцыятывы выхаванцаў, іх інтэлектуальных і творчых магчымасцях, ідэю арганізацыі пляцоўкі ў рамках акцый “Малая Радзіма: ад вывучэння да дзеяння”, “У заўтра я выбіраю дарогу” (прафарыентацыйная работа і працоўнае выхаванне), “Мы гэтай памяці верныя”, таксама ў рамках праекта “Збяры Беларусь у сваім сэрцы”. Таксама ва ўмовах лагернай змены будзем прадаўжаць работу пафарміраванню ў вучняў матывацыі ўчынкаў, засваенне норм паводзін, характэрных для праваслаўнай культуры.

У лагеры працы і адпачынку зыходным для нас стала палажэнне аб тым, што канікулы – вольны ад вучобы перыяд жыццядзейнасці – гэта асабісты час дзіцяці, якім ён мае права распараджацца па свайму

меркаванню, а яго змест і арганізацыя – актуальная жыццёвая праблема асобы дзіцяці, у вырашэнні якой абавязкова патрэбна дапамога дарослых.

Плануючы работу, абавязкова ўлічвалі ўзроставыя асаблівасці дзяцей ў перыяд з 14 гадоў, менавіта, іх імкненне быць самастойнымі ў вырашэнні пастаўленых перад імі задач.

Рэжым дня дапускае не толькі працоўную дзейнасць удзельнікаў змены, але і шырокае правядзенне спартыўных аздараўленчых мерапрыемстваў, арганізацыю рухомых гульняў, інтэлектуальных віктарын, краязнаўчых экскурій па вывучэнні гісторыі помнікаў духоўнай культуры рэгіёна, правядзенне старэйшымі школьнікамі для малодшых мерапрыемстваў духоўна-маральнай тэматыкі, эўрыстычныя гутаркі, і інш.

Галоўнае для педагагічнага калектыва – даць магчымасць кожнаму дзіцяці адчуць сваю значымасць у калектыве, паспрабаваць сябе ў розных карысных справах, а яшчэ прадаўжаць развіваць у сабе ўменне паважаць акружаючых, прыслухоўвацца да думак іншых, вучыцца суперажываць акружаючым.

**Мэта работы лагера працы і адпачынку:** забеспячэнне аздараўленчага, адукацыйнага, пазнаваўчага, змястоўнага дасуга, стварэнне ўмоў, садзейнічаючых фарміраванню культурнай свядомасці, уяўленняў аб асаблівасцях традыцыйных духоўна-маральных каштоўнасцей беларускага народа, святынь роднага краю.

**Задачы:**

- стварыць умовы для бесперапыннасці і пераемнасці выхаваўчага працэсу ва ўстанове адукацыі;
- садзейнічаць фарміраванню асобасных адносін дзіцяці да выканання маральных норм, развіццю індывідуальных якасцей асобы: міласэрнасці, справядлівасці, павагі да старэйшых, і інш.
- арганізаваць работу па фарміраванні ў старэйшых падлеткаў адказных адносін да розных відаў дзейнасці, імкнення да павышэння сацыяльнай актыўнасці як умовы асобаснай паспяховасці;
- ажыццявіць комплекс мер па фарміраванню культуры здаровага ладу жыцця, замацавання здароўя падлеткаў;
- стварыць умовы для эфектыўнай самарэалізацыі і паспяховай сацыялізацыі старэйшых падлеткаў праз працоўную дзейнасць, арганізацыю карыснага дасуга.

## Раздзел 3. ПЛАН РАБОТЫ ЛАГЕРА ПРАЦЫ І АДПАЧЫНКУ ДУХОЎНА-МАРАЛЬНАЙ НАКІРАВАНАСЦІ «САДРУЖНАСЦЬ», ЯКІ ПРАЦУЕ ПРЫ ДУА «ТУРЭЦКІ ВУЧЭБНА-ПЕДАГАГІЧНЫ КОМПЛЕКС ДЗІЦЯЧЫ САД-СЯРЭДНЯЯ ШКОЛА", з 15.07. 2019 г. па 07.08. 2019 г.

| | | |
|---|---|---|
| **15.07. 2019 г.** | **Дзень першы: "Мы ведаем, што патрэбны табе, наша дарагая радзіма" (у рамках акцыі "У заўтра я выбіраю дарогу". Профарыентацыйны накірунак работы)**<br><br>Дэвіз: "Кожны дзень для нас – імкненне зрабіць добрую справу" | 1. Прыём вучняў, арганізацыйная лінейка.<br>2. Правядзенне інструктажу па правілах тэхнікі бяспекі.<br>3. Працоўны дэсант. Праца з рэгламентаванымі перапынкамі.<br>4. Урок духоўнасці "Адказныя адносіны да свайго часу. Правільны распарадак дня"<br>5. Інтэрактыўная віктарына "Што можа чакаць вас у будучым?" (У рамках прафарыентацыі) |
| **16.07. 2019 г.** | **Другі дзень: "Каб здаровым быць фізічна і духоўна" (у рамках акцыі "Мы выбіраем здаровы лад жыцця"**<br>**Дэвіз**: "Кожны дзень мы выбіраем здаровы лад жыцця" | 1. Сустрэча сяброў. Ранішняя размова "Адказнасць за жыццё і здароўе як прынцып хрысціянскай маралі"<br>2. Фізкультурная размінка "Вясёлы крос".<br>3. Працоўны дэсант.<br>4. Сустрэча – інтэрактыўнае разважанне "Чалавечыя заганы, якія скарачаюць жыццё"<br>5. Спартландыя "Сіла духа і цела" |
| **17.07. 2019 г.** | **Дзень трэці: "Насустрач адкрыццям новага ў цудоўным акружаючым нас свеце"**<br>**Дэвіз:** "Для нас лета – нечаканыя адкрыцці на карысць сабе і акружаючым" | 1.Сустрэча-інтэлектуальнае разважанне "Маральныя нормы жыцця чалавека".<br>2. Фізкультурная размінка "Маё асабістае практыкаванне"<br>3. Працоўны дэсант. Праца з рэгламентаванымі перапынкамі.<br>4. Інтэлектуальная гульня - віктарына "Сыны Айчыны – наша духоўная спадчына". Музейны урок (У рамках акцыі "Мы гэтай памяці верныя"<br>5**. Творчая выстава "Сучасныя беларускія аўтары пра прыгажосць роднай мовы" (Да Дня роднай мовы)** |
| **18.07. 2019 г.** | **Дзень чацвёрты:** "**Каб яшчэ больш расквітнела наша Радзіма**" ( у рамках акцыі "Малая Радзіма – | 1. Сустрэча аднадумцаў.<br>2. Спартыўны калейдаскоп "Сярод летняй прыроды"<br>3. Працоўны дэсант. Праца з рэгламентаванымі перапынкамі. |

| | | |
|---|---|---|
| | эстафета карысных спраў"<br>**Дэвіз** "Пазнаём разам мудрасць нашых продкаў" | 4. Экскурсія "Помнікі нам расказваюць", аперацыя "Помнік" **(Да 75-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў)**<br>5. Сустрэча з удзельнікамі лагера "Здаравячок".<br><br>Правядзенне для іх гульні "Духоўныя матывы нашых учынкаў" **(У рамках праекта "Збяры Беларусь у сваім сэрцы")** |
| **19.07. 2019 г.** | **Дзень пяты: "Знаёмімся з духоўнай культурай рэгіёна"** ( у рамках праекта "Збяры Беларусь у сваім сэрцы")<br>**Дэвіз:**"Любоў да Радзімы – галоўная маральная якасць чалавека" | 1. Інтэрактыўная сустрэча-гульня "Мой дзень працы і адпачынку"<br>2. Мініспартландыя "Са спортам мы сябры"<br>3. Працоўны дэсант. Праца з рэгламентаванымі перапынкамі.<br>4. Экскурсія ў гарадскі пасёлак Мір "Помнікі духоўнасці рэгіёна" (Да Года малой радзімы)<br>5. Творчая справаздача аб экскурсіі<br>6. Мітынг каля помніка "Нельга забыць" (У рамках акцыі **"Беларусь памятае"** |
| **22.07. 2019 г.** | **Дзень шосты: "Міласэрнасць – адзін з прынцыпаў хрысціянскай маралі"**<br>**Дэвіз:** "Любіць бліжняга – наша духоўная праца. На шляху да грамадства дабрыні " | 1. Інтэрактыўная анкета "Мой рабочы тыдзень"<br>2. Вясёлы крос "Казачная сцяжынка"<br>3. Фізкультурная размінка<br>4. Цімураўская эстафета "Дапаможам людзям у працы, каб прынесці ім радасць" (У рамках акцый "Дом без адзіноты", " Сцяжынка добрых рук")<br>5. Сустрэча з удзельнікамі лагера "Здаравячок" "Урокі дабраты". Напісанне эсссэ "На шляху да грамадства дабрыні" |
| **23.07. 2019 г.** | **Дзень сёмы: "Завочнае спартыўнае падарожжа разам з Лесікам" (У рамках цыкла мерапрыемстваў "Па старонках II Еўрапейскіх гульняў"**<br><br>**Дэвіз:** "Перамагчы ўсе цяжкасці можа толькі моцны духам" | 1.Вясёлая размінка "Сустрэча ў летнім лагеры".<br>2. Крос "Летнія прыгоды"<br>3. Працоўны дэсант. Праца з рэгламентаванымі перапынкамі.<br>4. Спартыўная праграма "Усе на старт. Пераадоленне паласы перашкод" (У рамках акцыі "Мы выбіраем здароўе"). Спартыўнае падарожжа<br>5. Хвілінка індывідуальнага адпачынку і роздуму |
| **24.07. 2019 г.** | **Дзень восьмы: Вывучэнне духоўнай культуры рэгіёна ў рамках акцыі "Малая Радзіма: эстафета карысных спраў"** | 1. Сустрэча сяброў-аднадумцаў "Ствараем свой асабісты свет на карысць сабе і акружаючым"<br>2.Фізкультурная размінка<br>3. Працоўны дэсант. Праца з рэгламентаванымі перапынкамі<br>4. Наведванне храма ў вёсцы Вялікая Слабада. |

| | | |
|---|---|---|
| | Дэвіз: “Зярняткі мудрасці шукаем на сцяжынках краю” | 5. Мініэкскурсія ў прыроду “Дзівоснае і незвычайнае побач” **(У рамках акцыі Логін: лета. Пароль: малая радзіма)**<br>5. Творчая справаздача аб экскурсіі |
| **25.07. 2019 г.** | **Дзень дзявяты: “Подзвіг святасці ў гісторыі Малой Радзімы”**<br>**Дэвіз: “Вывучаючы гісторыю малой Радзімы, пазнаём мудрасць жыцця”** | 1. Сустрэча-конкурс “<br>2. Вясёлая фізічная зарадка<br>3. Працоўны дэсант. Праца з рэгламентаванымі перапынкамі.<br>4. Інтэрактыўная сустрэча “Таямнічая гісторыя маёй радзімы” (У рамках акцыі “Тэрыторыя новых ведаў”<br>5. Сустрэча з удзельнікамі лагера “Здаравячок” . “Аповед пра гістрыю духоўнай культуры малой Радзімы” |
| **26.07. 2019 г.** | **Дзень дзясяты:** “Экалагічная адысея”<br>**Дэвіз**: “Давайце разам з намі пройдзем па экалагічных сцяжынках” | 1. Сустрэча сяброў “Наш незвычайны лагер”.<br>2. Фізкультурная зарадка “Хто мацнейшы”<br>3. Працоўны дэсант. Праца з рэгламентаванымі перапынкамі.<br>4. **Брэйн-рынг “Экалагічны дэсант ”. (У рамках акцыі “Малая радзіма: эстафета карысных спраў”)**<br>5. Хвілінка разважання “І яшчэ адзін дзень прайшоў…” |
| **29.07. 2019 г.** | **Дзень адзінаццаты: “Лета – пара бяспечных паводзін”**<br>**Дэвіз:** “Удзельнікі лагера за бяспеку жыцця” | 1.Сустрэча-разважанне “Новы дзень – новыя справы”<br>2. Вясёлая гімнастыка<br>3. Працоўны дэсант. Праца з рэгламентаванымі перапынкамі.<br>4. Алімпіяда па правілах дарожнага руху. Конкурсная праграма “За бяспеку жыцця” (У рамках акцыі “Нашы дзеці”)<br>5. Падвядзенне вынікаў дня |
| **30.07. 2019 г.** | **Дзень дванаццаты: “Дзень прыгожых і карысных спраў. Пісьменнікі роднага краю майго ”**<br>**Дэвіз**:“Кожны марыць быць прыгожым як знешне, так і душой” | 1.Конкурс-прывітанне “Пры сустрэчы гаворым адзін аднаму душэўныя цёплыя словы”.<br>2. Гімнастыка – фізкультурны калейдаскоп.<br>3. Працоўны дэсант. Праца з рэгламентаванымі перапынкамі.<br>4. Праграма добрых спраў “Летнім часам”. (У рамках акцыі “Спяшайцеся рабіць дабро”)<br>5. Калектыўнае чытанне і абмеркаванне твораў паэтаў і пісьменнікаў **Гродзеншчыны (Да Дня роднай мовы”** |
| **31.07.** | **Дзень трынаццаты:** | 1. Сустрэча сяброў-аднадумцаў |

| | | |
|---|---|---|
| **2019 г.** | **“Айчына як святое паняцце” (у рамках акцыі “Мы гэтай памяці верныя”**<br>**Дэвіз:** “Памяць подзвіга народа – захаванне і павелічэнне славы Радзімы” | 2.Летні крос.<br>3. Працоўны дэсант. Праца з рэгламентаванымі перапынкамі.<br>4. Акцыя “Помнікі нам шмат аб чым гавораць”<br>5. Экскурсійнае падарожжа “Мінск – горад –герой” (Да 45-годдзя з дня прысваення Мінску ганаровага звання “Горад-герой”. Наведванне Нацыянальнай бібліятэкі, музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны) |
| **01.07. 2019 г.** | **Дзень чатырнаццаты: “Дзень здароўя”**<br>**Дэвіз:** “Імкнуцца трэба ў жыцці здаровым быць душой і целам” | 1.Радасная сустрэча сяброў “Новыя справы на новы дзень”<br>2. Фізкультурная зарадка “Аднойчы ў летні дзень”<br>3. Працоўны дэсант. Праца з рэгламентаванымі перапынкамі.<br>4. Круглы стол з зампрашэннем медыцынскіх работнікаў “Прафілактыка кепскіх звычак”<br>5. Танцавальны конкурс “Вясёлае лета” |
| **02.08. 2019 г.** | **Дзень пятнаццаты: “Дзень прафесіянала”. Праваслаўная культура адносін да грамадзянскага абавязку**<br>**Дэвіз:** “У заўтрашні дзень я выбіраю дарогу” | 1.Конкурс добрых слоў пры сустрэчы.<br>2. Фізкультурны калейдаскоп.<br>3. Працоўны дэсант. Праца з рэгламентаванымі перапынкамі.<br>4. Конкурсна-гульнёвая праграма “Калейдаскоп прафесій” .<br>5. Хвіліны-разважанні“Прафесіі маіх бацькоў”, “Сумленная праца на карысць краіны” |
| **05.08. 2019г.** | **Дзень шаснаццаты: “Знаёмімся з духоўнай культурай рэгіёна” ( у рамках праекта “Постаці слаўныя краю майго ”)**<br>**Дэвіз:**“Любоў да Радзімы – галоўная маральная якасць чалавека” | 1. Інтэрактыўная сустрэча-гульня “Мой дзень працы і адпачынку”<br>2. Мініспартландыя “Са спортам мы сябры”<br>3. Працоўны дэсант. Праца з рэгламентаванымі перапынкамі.<br>4. Экскурсія ў Лаўрышава Навагрудскага раёна<br>5. Творчая справаздача аб экскурсіі |

| | | |
|---|---|---|
| **06.08. 2019 г.** | **Дзень сямнаццаты “Лета – пара для дабраты і міласэрнасці”**<br>**Дэвіз:** “Імкнуцца рабіць дабро – галоўная якасць для чалавека” | 1. Інтэрактыўная размінка “Летні настрой”<br>2. Фізкультурная размінка<br>3. Працоўны дэсант. Праца з рэгламентаванымі перапынкамі.<br>4. КТС “Стварай дабро” (У рамках акцыі “Дом без адзіноты”)<br>5. Размова за чаем “Чалавечнасць у чалавеку”<br>6. Правядзенне конкурса малюнкаў з удзельнікамі лагера “Здаравячок” “Благаславеннае дабро на зямлі” |
| **07.08. 2019 г.** | **Дзень васямнаццаты:** “Маёй роднай зямлі незабыўны куток”<br>**Дэвіз**: “Спраўдны грамадзянін той, хто пастаянна ўпрыгожвае сваю зямлю” | 1.Радасная сустрэча ў любімым лагеры працы і адпачынку.<br>2. Зарадка-конкурс “Займайся фізічнай культурай так, як я”.<br>3. Працоўны дэсант. Праца з рэгламентаванымі перапынкамі.<br>4. Экалагічная акцыя па добраўпарадкаванні тэрыторыі “Прыгажосці і чысціня вакол нас**” (Да Года роднай зямлі”**<br>5**.** Урачыстае закрыццё лагернай змены “Мы імкнуліся ў лагеры зрабіць шчаслівымі сябе і акружаючых” |

План складзены начальнікам лагера Т.В. Гарох

**Раздзел 4. Матэрыяльна-тэхнічнае забеспячэнне**

Для якаснай работы лагера створана адапаведная матэрыльна-тэхнічная база:

- Метадычная бібліятэка для педагогаў-выхавацеляў.
- Бібліятэка дзіцячай мастацкай літаратуры.
- Актавая зала, дзе праводзяцца масавыя мерапрыемствы.
- Гульнятэка, якая ўключае ў сабе разнастайныя настольныя і рухомыя гульні навучальнага і развіваючага характару, якія актыўна выкарыстоўваюцца для арганізауыі дасуга дзяцей.
- Спартыўнае абсталяванне, спартыўная зала.
- Раздатачны матэрыял: табліцы, малюнкі, фішкі для правядзення гульняў.
- Музыка, ноты, вершы.
- Фотаілюстрацыі.
- Сцэнарыі мерапрыемстваў.

## Метадычнае забеспячэнне

- Метадычная бібліятэка для педагогаў-выхавацеляў.
- Зборнік "Лета – 2018"
- Адукацыйная праграма.
- Інструктыўна-метадычнае пісьмо "Аб мерах па ўдасканаленню работы выхаваўча-аздараўленчых установ адукацыі".
- Канцэпцыя дзіцячага адпачынку і аздараўлення.
- Метадычныя рэкамендацыі у дапамогу арганізатарам летнягя адпачынку.
- Педагагічны дзённік.
- Дзённік педагога-арганізатара.

## Кадравае забеспячэнне

Начальнік лагера – наместнік дырэктара па выхаваўчай рабоце Т.В. Гарох
Псіхолага-педагагічнае суправаджэнне работы змены – педагог-псіхолаг Факеева Ю.С.;
Выхавацелі: настаўнікі Ракач С.В., Цаба І.В., Цаба С.Г.,Стэльмах М.Дз.